# Прамова тав. Ц. Я. Кісялёва

**Сакратар Брэсцкага абкома КП Беларусі**

Таварышы! З даклада сакратара ЦК КПБ тав. Патолічава відаць, што Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі Беларусі за справаздачны перыяд прарабіў вялікую арганізатарскую і палітычную работу па мабілізацыі шырокіх мас працоўных на далейшы ўздым народнай гаспадаркі рэспублікі, накіроўваў дзейнасць абласных, гарадскіх і раённых партыйных арганізацый на выкананне задач, пастаўленых XIX з'ездам партыі і вераснёўскім Пленумам ЦК КПСС.

Брэсцкая абласная партыйная арганізацыя, выконваючы рашэнні партыі і ўрада, дабілася некаторых станоўчых вынікаў у развіцці сельскай гаспадаркі, арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, у падборы і выхаванні кадраў.

Пасля вераснёўскага Пленума ЦК КПСС накіравана на работу ў вёску звыш 500 комуністаў, створана 46 новых калгасных партыйных арганізацый. На пасады старшынь калгасаў падабрана 259 чалавек, з іх 223 прыступілі ўжо да работы. Сярод пасланых на работу ў калгасы і МТС вялікая група кіруючых абласных і раённых работнікаў — загадчыкі аддзелаў аблвыканкома, сакратары райкомаў партыі, старшыні і намеснікі старшынь райвыканкомаў і другія таварышы, якія добра зарэкамендавалі сябе на практычнай рабоце.

Праведзена значная работа па ўмацаванню кадрамі машынна-трактарных станцый. Зараз у 42 МТС вобласці ёсць 1.219 інжынераў, тэхнікаў і іншых спецыялістаў. У калгасы вобласці накіравана 487 аграномаў і зоатэхнікаў.

Трэба адзначыць, што абсалютная большасць таварышаў, накіраваных у МТС і калгасы, актыўна ўключылася ў барацьбу за вырашэнне пастаўленых партыяй задач.

Праведзена таксама некаторая работа па ўмацаванню саставу сакратароў райкомаў КПБ і сакратароў партарганізацый МТС. Цяпер 80 працэнтаў сакратароў райкомаў партыі маюць вышэйшую і незакончаную вышэйшую адукацыю, значны стаж партыйнай работы.

Аднак першыя практычныя вынікі ў вырашэнні задач уздыму сельскай гаспадаркі яшчэ нязначныя. Недахопы, выяўленыя вераснёўскім Пленумам ЦК КПСС, ліквідуюцца марудна.

Зацягнулася перабудова работы абкома і райкомаў партыі. У радзе раёнаў гэтая перабудова праводзілася фармальна. На паперы ўсё было па-новаму, а работа ішла па-старынцы, таму што многія сакратары па зонах і інструктары райкомаў партыі жывуць у раённых цэнтрах і бываюць у калгасах рэдка, наездамі.

Тав. Патолічаў у справаздачным дакладзе зусім правільна назваў стыль работы некаторых партыйных органаў, у тым ліку і Брэсцкага абкома, фармальна-бюракратычным. За такі стыль работы нясуць адказнасць не толькі абкомы і райкомы партыі, але і ЦК КПБ, яго бюро, сакратары. У рабоце ЦК КПБ яшчэ поўнасцю не зжыты элементы фармальна-бюракратычнага кіраўніцтва. Члены бюро, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ рэдка бываюць у абласцях і раёнах, мала дапамагаюць райкомам і абкомам партыі.

У вобласці праведзена некаторая работа па развіццю грамадскай жывёлагадоўлі, павелічэнню пагалоўя жывёлы і павышэнню яе прадукцыйнасці. Аднак тэмпы росту грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах яшчэ нізкія. Гэтыя недахопы тлумачацца побач з іншымі прычынамі незадавальняючым зоаветэрынарным абслугоўваннем калгасаў. У сучасны момант на 570 калгасаў Брэсцкай вобласці ёсць толькі 96 зоатэхнікаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй, а непасрэдна ў калгасах працуе толькі 56. Асабліва дрэнна абстаіць справа з зоаветэрынарным абслугоўваннем калгасаў Бярозаўскага раёна. Толькі па аднаму зоатэхніку маюць Дамачоўская, Косаўская і іншыя МТС вобласці. Так атрымалася таму, што Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР допусціла буйныя памылкі ў размеркаванні зоатэхнікаў і ветурачоў і марудна выпраўляе іх.

У гэтым годзе ў МТС вобласці будзе праводзіцца вялікае будаўніцтва, для чаго дзяржавай адпушчана больш 18 мільёнаў рублёў. Упершыню намечан такі вялікі аб'ём работ. Але Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР не кіруе будаўніцтвам у МТС, у выніку чаго яно па сутнасці яшчэ не пачата. У студзені па вобласці выкарыстана на гэтую мэту толькі 200 тысяч рублёў.

Таварышы! Крытычныя заўвагі, якія былі выказаны ў дакладзе тав. Патолічава, поўнасцю датычаць работы Брэсцкай абласной партыйнай арганізацыі. Мы прымем усе меры да таго, каб як мага хутчэй ліквідаваць недахопы.

Дазвольце запэўніць XXI з'езд Компартыі Беларусі, што Брэсцкая абласная партыйная арганізацыя яшчэ цясней згуртуе свае рады вакол Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Совецкага Саюза, не пашкадуе сіл для вырашэння задач, пастаўленых партыяй і ўрадам у справе далейшага ўмацавання магутнасці нашай краіны.